ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 37 (419) Пятніца, 1 красавіка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комсам. 25.

ВІТАЕМ БРАТА з ПЯЦІГОДЗЬДЗЕМ!

Комсамолу Польшчы споўнілася пяць гадоў

Маладыя рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі заўсёды гатовы стаць поплеч з Комсамолам Польшчы ў яго барацьбе за лепшае заўтра працоўных

Братняе прывітаньне.

ЦК ЛКСМБ ад імя рабоча-сялянскай моладзі БССР шле брацкае прывітаньне Комуністычнаму Саюзу Моладзі Польшчы ў сувязі з 5-цігодзьдзем яго існаваньня.

Ужо 5 год рабоча-сялянская моладзь Польшчы вядзе пад сьцягам КСМ рэволюцыйную барацьбу, выкрываючы на кожным кроку бясприкладны гэроізм, закалку і непаломную волю. Ні крывавы тэрор асьцервянелага фашызму, ні турэмныя сьцены, ні нават сьмерць—не змаглі запужаць працоўную моладзь Польшчы і ўтрымаць яе ад рэволюцыйнай барацьбы.

На працягу ўсіх 5 год свайго існаваньня комсамол Польшчы стаяў на варце Ленінізму, забараняючы працоўную моладзь ад пагібельных уплываў опортунізму, якія імкнуліся расклясьці саюз, як знутры, так і знадворку.

Пад кіраўніцтвам КП Польшчы—комсамол Польшчы вёў і вядзе моладзь сьцежкамі бязьлітаснай барацьбы супроць уціску капіталістых і паноў, заваяваў сабе гэтым шырокія сымпатыі і популярнасьць сярод працоўных мас моладзі Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны.

За кароткі час свайго існаваньня, ня гледзячы на невыказана цяжкія ўмовы падпольнай працы, комсамол Польшчы пасьпеў стаць сапраўды масавай, дысцыплінаванай організацыяй, вылучыўшы з свайго асяродку шэраг такіх беззаветных барацьбітоў, як расьцерзаныя буржуазіяй Энгель, Ботвін, Кніеўскі, Руткоўскі.

І мужасная сьмерць, сьмерць за справу працоўных, за дыктатуру пролетарыяту ў Польшчы, за вызваленьне рабочай клясы, сялянства і нацыянальных меншасьцяй з-пад фашыцкага панскага іга, сьмерць з гордым крыкам „Няхай жыве комсамол Польшчы" на вуснах—няхай паслужыць прыкладам для кожнага з нас: так павінен змагацца і паміраць комсамолец за вялікую справу вызваленьня працоўных.

Сёньня, перад тварам новай надыходзячай бойні, якую, прагнучыя да золата і рынкаў, капіталістыя рыхтуюць, у першую чаргу, супроць СССР—перад комсамолам Польшчы і Беларусі, роўна, як і перад комсамолам усяго сьвету, стаіць задача яшчэ больш цеснага сплачэньня сваіх шэрагаў, і яшчэ большага ўмацаваньня дысцыпліны ў сваіх організацыях—дапамагчы, з непарушнай сілай, працівастаяць спробам капіталу зноў затапіць у крыві міжнародны рэволюцыйны рух.

Іх таму сёньня Ленінскі Комуністычны Саюз Моладзі Беларусі ад імя ўсёй масы працоўнай моладзі БССР - вітае брацкую організацыю КСМП і яшчэ раз запэўнівае, што маладыя рабочыя і сяляне БССР цьвёрда памятаюць аб міжнароднай пролетарскай салідарнасьці і заўсёды гатовы стаць поплеч з комсамолам Польшчы ў яго барацьбе за лепшае заўтра працоўных.

Няхай жыве КСМ Польшчы!

Няхай жыве ЛКСМБ!

Няхай жыве КІМ!

ЦК ЛКСМБ.

Пяцігодзьдзе польскага комсамолу

У другой палове сакавіка гэроічны польскі комсамол сьвяткаваў пяцігодзьдзе свайго існаваньня. У гэтыя дні ў Польшчы ў конспіратыўных пакоях зьбіраліся комсамольцы і паводзілі вынікі пяцігадовай працы і барацьбы. У гэтыя дні наладжваліся замаскіраваныя сходы рабочай і сялянскай моладзі на заводах і ў профсаюзах, паўсюды, дзе гэта ўдавалася для дакладаў аб пяцігадовай працы польскага комсамолу.

Гэтыя пяць год для яго—нязвычайныя пяць год. Роза Люксембург неек казала, што для рэволюцыйнай партыі адзін дзень барацьбы ў часе рэволюцыі значыць толькі, колькі месяцы і гады працы ў звычайны час. Аб польскім КСМ можна сказаць: кожны дзень з гэтых пяці год упартай барацьбы ва ўмовах сапага жорсткага тэрору маюць копт тыдняў і месяцаў.

Цягаценьне працоўнай моладзі да КСМП, якое констатуюць нават самыя рэакцыйныя часопісі—гэта вынік непамерна цяжкіх умоў, у якіх прыходзіцца жыць моладзі ў Польшчы. Уплыў польскага КСМ сярод рабочай моладзі ўсё павялічваецца, таму «незалежная» што «Польшча дала ёй толькі голад, беспрацоўе, адсутнасьць професыйных школ і г. д. Польская буржуазія прымушае рабочую моладзь працаваць 12 і больш гадзін, плаціць ёй ад 15 капеек да 50 к. у дзень, не дае дапамогі маладым беспрацоўным і г. д. І калі польскія соцыялістыя і ў профсаюзах і ў юнацкіх організацыях не дапушчалі ні да якай барацьбы за паляпшэньне яе становішча, зачынялі сэкцыі моладзі пры профсаюзах і інш, тады адзіны польскі комсамол вёў моладзь да барацьбы. Роля, якую адыграў КСМ у часе розных забастовак, якімі ён кіраваў, у часе дэмонстрацый беспрацоўнай моладзі, у кіраўніцтве кампаніяй за сэкцыі моладзі, у кампаніях за адзіны фронт і інш. вырашыла перш за ўсё аб масавым пераходзе рабочай моладзі з лягеру згоднікаў у лягер барацьбы. Непамагло соцыялістым недапушчэньне імі займацца наогул політычнай барацьбой саюзам соцыялістычнай моладзі, не памаглі крыкі аб «агентах Масквы», жыцьцё рабіла сваё. Рост польскага комсамолу сярод рабочай моладзі апіраецца на вялізарны рост разачараваньня яе да цяперашняй Польшчы. І ня дзіўна, што буржуазны друк крычыць, апасаючыся росту КСМ, што працоўнай моладзі трэба даць «ідэю»; буржуазныя політыканы не разумеюць, што ім гэтай ідэі не знайсьці!..

Аднačасова з гэтым узростам КСМ і яго ўплыву, павялічваецца актыўнасьць саюзу, мацнее яго організацыя, разьвіваецца саюз ва ўсіх адносінах.

За пяць год свайго існаваньня польскі КСМ вырас з маленькай організацыі ў вялікі саюз, уплыў якога пашыраецца на дзесяткі тысяч маладых рабочых і сялян. Популярнасьць яго такая вялікая, што можна сказаць: няма ўжо цяпер у Польшчы маладога рабочага-паляка, украінца, беларуса ці яўрэя, які ня ведаў-бы гэтых трох літар. «Z. M. K.» (КСМ).

Комсамол Польшчы зьяўляецца адзіным вялікім політычным саюзам рабочай, а таксама сялянскай моладзі ў Польшчы.

І гэтую выключную позыцыю сярод рабочай моладзі КСМ заваяваў, ня гледзячы на крывавы тэрор польскіх катаў, ня гледзячы на ўсякія перасьледаваньні, ня гледзячы на тое, што амаль кожны дзень новыя дзесяткі комсамольцаў пападае ў турмы. Ня гледзячы на тое, што многім прыдзецца, можа, згінуць у турмах і хоць крывавыя каты катуюць арыштаваных, у КСМ уступаюць усё новыя і новыя маладыя рэволюцыянэры. Імёны: Кніеўскага, Руткоўскага, Энгэля, Ботвіна і іншых маладых польскіх комсамольцаў гэроічна згінуўшых з выкрыкам: «Няхай жыве КСМ Польшчы»—застануцца на заўсёды ў памяці сусьветнага комсамолу. І хоць больш 2000 моладзі знаходзіцца ў турмах, хоць сёньня па пальцах можна зьлічыць комсамольцаў з 1922 году, якія знаходзяцца яшчэ на волі—КСМ расьце, крэпне і будзе расьці.

Цяпер польскаму КСМ прыходзіцца працаваць у самых цяжкіх умовах, калі Пілсудзкі патапляе ў крыві рэволюцыйны рух у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, калі падрыхтоўваюцца надзвычайныя законы супроць комуністых (польскім фашыстым нехапае гэтага дзікага белага тэрору, які разгульвае ў панскай Польшчы), калі польскімі мілітарыстымі адкрыта падрыхтоўваецца вайна супроць СССР.

У такі момант перад польскім комсамолам стаіць вялізарная задача барацьбы супроць фашысцкага ўраду, супроць вайны з СССР—за рабоча-сялянскую Польшчу. Мы ўпэўнены, што, ня гледзячы на ўвесь крывавы тэрор фашыстых, польскія комсамольцы аддана і далей павядуць гэтую барацьбу разам з компартыяй Польшчы.

Нашай задачай, задачай шэфаў польскага комсамолу—маладых рабочых і сялян Савецкай Беларусі—зьяўляецца: дапамагчы ўсімі сіламі ў выкананьні польскімі комсамольцамі гэтай задачы.

Комсамол Польшчы ў барацьбе.

З моманту свайго ўзьнікненьня*) КСМП знаходзіцца ў падпольлі. Саюз ня ведаў ніколі легальнасьці. Калі прыняць пад увагу, што вялікая колькасьць сяброў КСМП складала моладзь, прышоўшая з легальных соцыялістычных організацый моладзі і з профсаюзаў—тады стане зразумелым, якія цяжкасьці прадстаўляла для саюзу гэтая падпольная праца маладых ня вопытных юнакоў. Трэба было шукаць новых мэтодаў працы, вучыцца зьвязваць падпольную комсамольскую організацыю з масай беспартыйнай моладзі. Вядома, першыя крокі былі вельмі цяжкімі. Нявопытнасьць, недастатковасьць конспірацыі прыводзілі да частых правалаў. Амаль з моманту ўзьнікненьня саюзу польскія комсамольцы пазнаёміліся з турмамі.

З 600 да 6000.

Пачаў польскі комсамол сваю працу, як маналікая організацыя (каля 600 сяброў), маючая ў сваім складзе большасьць яўрэйскай моладзі, ніводнага амаль беларуса і ўкраінца. Гэты малы процант польскай моладзі ў пачатку існаваньня КСМ зразумелы: гэта быў час, калі сярод усёй польскай моладзі яшчэ вельмі моцнымі былі патрыётычныя настроі. Толькі самая перадавая частка польскіх маладых рабочых зразумела ў часе вайны з СССР, што змагалася не за «народ», як ёй казалі, а для польскай буржуазіі і паноў. Расстрэленыя буржуазнымі катамі ў 1924 і 1925 годзе польскія комсамольцы: Кніеўскі, Руткоўскі, Энгэль—гэта некаторыя з іх. А колькі з тых, якія атрымалі баявыя сьцягі «за харобрасьць», сядзяць цяпер за сьценкамі!

Малой, нямаючай вялікага ўплыву, організацыяй быў польскі комсамол пяць год таму назад. А цяпер. За пяць год польскі комсамол вырас у самую большую з усіх нелегальных сэкцый КІМ'у. За пяць год саюз вырас колькасна ў 10 раз—да 6 тысяч сяброў! (Мы не павінны забываць, што ўсе яны організаваны ў падпольных ячэйках). Гэты ўзрост адбываўся перш за ўсё, за кошт польскай прамысловай моладзі, за кошт беларускай (больш тысячы сяброў) і украінскай сялянскай моладзі. Цяпер соцыяльны склад саюзу такі: 75 проц. рабочай, 20 проц. сялянскай моладзі, 5 проц.—іншых.

„Мне было вельмі балюча".

Сярод сялянскай моладзі саюз пачаў сваю працу толькі з гэтага моманту, калі прыняў разам з партыяй, правільны ленінскі пункт погляду па сялянскаму пытаньню (канец 1923 году). Разам з палявеньнем вёскі ў Польшчы за апошнія гады, у вялізарным тэмпе той-жа процэс адбываецца і сярод польскай сялянскай моладзі. Гэта стварыла добрую глебу для працы КСМ, якая за апошнія два гады павялічваецца. Якія настроі польскай сялянскай моладзі, а гэтым могуць сьведчыць наступныя словы аднаго буржуазнага профэсара, які быў на зьездзе саюзу сялянскай моладзі (кіраўнікі саюзу—стаўленьнікі Пілсудзкага) у 1926 годзе: «патрабаваньне маладым селянінам зямлі бяз выкупу і інш., страшныя патрабаваньні—гэта небясьпечная хвароба». Той-жа профэсар піша: моцнай комсамольскай групе на зьездзе ўзмацнена апладыравалі, што мне было вельмі балюча».

Праяўленьнем палявеньня моладзі ў польскай вёсцы зьяўляецца таксама факт узьнікненьня ў 1926 годзе саюзу левай сялянскай моладзі, выпускаючай часопісь «Орка» і левага крыла ў згодніцкім саюзе сялянскай моладзі. КСМ уплывае на гэты левы рух.

Ня гледзячы на падпольле

Павялічылася праца КСМ на ўсходніх акраінах, перш за ўсё, у Заходняй Беларусі, а таксама у Заходняй Украіне.

Рост актыўнасьці яго праяўляецца і ва ўсякіх кампаніях, як партыйных, так і комсамольскіх, і ва ўдзеле ў дэмонстрацыях. Гэройства, адданасьць, мужаства, ініцыятыва комсамольцаў вядома ўсёй польскай рабочай клясе. Ці ідзе справа аб вывешваньні сьцягаў на самых высокіх мясцох, ці ідзе справа аб расклейцы лістовак аб кампаніях у сувязі з выбарамі ў бальнічную касу—комсамолец паўсюды першы.

Разам з тым адбываецца паглыбленьне політычнай актыўнасьці і політычна-выхаваўчай працы ўнутры саюзу. Гэтая праца вельмі цяжкая ва ўмовах падпольля. Няма часопісаў, няма кніг, цяжка сабрацца, а вельмі часта няма нават кіраўнікоў. Але польскі комсамол можа таксама і ў гэтай галіне пахваліцца вялікімі дасягненьнямі. Акрамя друкаваных у друкарні часопісаў на 4-х мовах, выходзіць вялікі лік часопісаў, надрукованых на гэктаграфе, бюлятэняў, тэзісаў, а нават у апошні час шмат ячэек пачалі выпушчаць свае гэктографаваныя фабрычныя газэты. У акругах узьніклі школы політграматы, школы дакладчыкаў і інш.

Кажучы, аб дасягненьнях КСМП, мы павінны яшчэ ўказаць на антымілітарысцкую працу і агітацыю ў арміі. Частыя процэсы, як апошні ў 1927 годзе ў Варшаве 34 салдат, удзел салдат у комсамольскіх дэмонстрацыях сьведчыць, што і ў гэтай галіне працы КСМП ня сьпіць.

У некалькіх словах трэба ўказаць на вельмі важнае для працы саюзу ўмацаваньне сувязі з партыяй, на дасягненьне ў працы сярод вучнёўскай моладзі (забастоўкі студэнтаў у 1926 г. пад уплывам КСМП), на працу спортыўную, а таксама і на працу піонэрскую, якая таксама разьвіваецца ў падпольлі.

Ёсьць і недахопы

Адным з важнейшых недахопаў, які паказаў сябе за гэтыя пяць гадоў гэта той факт, калі комсамол разам з партыяй зрабіў шэраг, як ультра-левых, так і апошніх правых памылак. Гэта кажа за тое, што КСМ ня змог яшчэ высунуць такога кадру кіраўніцтва, якое здолела-б у час выступіць супроць антыленінскіх ухілаў у партыі.

Адзначаючы гэты недахоп, трэба ўказаць адначасова, што часта КСМП правільна выступаў за ленінскую лінію ў барацьбе супроць ухілаў у партыі. Гэта адносіцца да пэрыоду барацьбы ў канцы 1923 году і палове 1924 г. і да барацьбы пасьля буйнейшай майскай памылкі 1926 году.

Адзначым яшчэ такія памылкі, як адсутнасьць працы сярод батрацкай моладзі, вельмі слабая праца сярод дзяўчат, поўная адсутнасьць працы сярод нямецкай рабочай моладзі, недастатковая сувязь польскай часткі КСМ з украінскай і беларускай.

Я. Лясоцкі.

*) Пачаткам існаваньня польскага КСМ лічым І-ы зьезд (сакавік 1922 г.), зьвязаўшы існуючыя ўжо раней (некаторыя з пачатку 1919 г.) групы комуністычнай моладзі ў адну цэнтральную організацыю.

СТРАШНАЕ ПРАДВЕСЬНЕ

Перадрук з газэты «Наша воля», конфіскаванай польскім урадам.

Прадвесьне—найцяжэйшая пара ў жыцьці нашае вёскі

Дый ня дзіва: Заходняя Беларусь—гэта край вялікіх дворных абшараў і тыповага сялянскага малазямельля. Ня маючы якой колечы паважнай статыстыкі зямельных адносінаў з навейшага часу і заглянуўшы ў даваенныя статыстычныя досьледы (1909 году), мы ўбачым, што ўжо тады ў межах Заходняе Беларусі было 107.650 сялянскіх гаспадарак, меншых за 2 гектары, 195.980—ад 2 да 5 гэктараў, 138.800—ад 5 да 10 гэктараў, і толькі 50.000 з нечым гаспадарак былі адносна заможныя—мелі звыш 10 г. Ведама, пры добрай глебе—жыць так сяк можна было-б; ды толькі глеба гэтая ў нас пераважна бедная, слаба ўрадлівая, і можна сьмела сказаць, што гаспадаркі першых дзьвюх катэгорыяў, якія складаюць разам 61 проц. усяе лічбы сялянскіх гаспадарак, вядуць поўгалоднае жыцьцё. І калі да вайны, якія тыповыя малазямельнікі мелі сякі-такі заробак на старане, ці то ідучы ў места, ці працуючы ў двары—дык цяпер гэты заробак у значнай меры адпаў. У места ісьці няма па што, а ў двары і парабкоў ужо пачалі выпісваць з каранное Польшчы.

Пры такім палажэньні ды пры вельмі значных падатковых цяжарах, якія плоце вёска, даволі нават невялікага недароду, каб на прадвесьні ў нашы вёскі завітаў няпрошаны госьць—**голад**. А сёлета ўся паўночна-ўсходняя часьціна Заходняе Беларусі крэпка пацярпела ад неўраджаю. Да таго-ж у прыгранічным поясе дагэтуль яшчэ людзі не адбудаваліся пасьля ваеннае руіны, і толькі сёлета польскі ўрад пастанавіў паважней заняцца гэтай справай...

Якую-ж дапамогу і скуль могуць дастаць пацярпеўшыя сёлета ад галадухі вёскі.

Польскі ўрад, клапоцячыся перад усім аб тым, каб зямля не засталася на новы гаспадарчы год неабсеянай, асыгнаваў крэдыт на пасеў збожжа ў Віленшчыне ў ліку аднаго мільёну злотых. З гэтае сумы 50.000 злотых адкінута, як запасны фонд—дык да падзелу адсталося 950.000 злот. на сем паветаў. Дый самы падзел аддадзены ў рукі выключна польскіх крэдытных установ, абмінуўшы цалком беларускія—найбольш блізкія да вёскі і найлепш ведаючыя балячкі і патрэбы яе.

Вось-жа пры ўсёй нязначнасьці сумы, на якую дадзены крэдыт, выклікае шмат сумляваньняў і спосаб падзелу крэдытаў на насеньне... Характэрна, што нават польская прэса («Кур. Вілен.») зварачвае ўвагу на тое, што пры падзеле крэдытаў паводле гмінаў шмат з іх аказалася чамусьці зусім абойдзеннымі. Але-ж пацярпеўшая ад няўроды беларуская вёска патрабуе помачы ня толькі на тое, каб забясьпечыцца на наступны год: ужо сёньня на прадвесьні, ў ёй шмат каму не хапае хлеба на пракорм. Патрэбна гмінная дапамога, на якую ўрад зварачвае вельмі мала ўвагі: тут урадавая помач зусім малая.

Гэтак Віленскі Ваявода вызначыў на такую даразную помач усяго толькі дзесяцітысячны аванс які дзеліцца па паветах гэтак: Браслаўскі павет—4000 злотых, Дзісьненскі—1500, Сьвянцянскі 2500 Пастаўскі—1500 і Вялейскі 500 зл. Лічбы гэтыя лішніе красамоўна гавораць самі за сябе, каб трэба было яшчэ высьняць іх значэньне.

Ясна, што бяз шырокае грамадзкае дапамогі тут абыйсьціся немагчыма. І яна лёгка знайшлася-б у межах Польшчы, калі-б пацярпелі чыста польскія паветы. Але аб «крэсах» думаюць толькі тады, калі трэба на іх «забясьпечваць польскія інтарэсы»... Дык з тым большым здаваленьнем мы мусім тутатка адзначыць, як горача адгукнуліся нашы браты—беларускія сяляне на тым баку гранічнае мяжы. Як відаць з газэтных вестак, у Ўсходняй Беларусі па ўсіх вёсках, мястэчках і местах адбываюцца публічныя зборкі, як грошы, так і хлеба—дзеля дапамогі сялянству Заходняе Беларусі. І народ дае свае ахвяры ахвотна і радасна, разумеючы, што гэтая братняя помач мае ня толькі вялізарнае матар'яльнае, але і моральнае значэньне.

Але гэтага мала: на помач нашаму сялянству павінны пасьпяшыць і беларускія эмігранты ў Амэрыцы, якія пэўне-ж маюць тут, у старой бацькаўшчыне, родных і сваякоў. Помач пацярпеўшых ад неўраджаю беларускім сялянам мусіць быць організавана ў шырокім усебеларускім маштабе, і падзелена рукамі самых пацярпеўшых—іх організацыямі. Толькі тады мы здолеем неяк перабедаваць сёлетняе страшнае прадвесьне.

Тысячакратны праклён.

(Рэзолюцыя Менскай рабочай моладзі па дакладу аб падзеях ў Кітаі).

Заслухаўшы даклад т. Казюра „Аб Кітаі і Кітайскай рэволюцыі", мы рабочая і вучнёўская моладзь гор. Менску шлём юнацкае прывітаньне рэволюцыйнаму народу Кітая які змагаецца за сваё вызваленьне, які зьяўляецца першым з усіх прыгнечаных колёніяльных народаў падняўшым сьцяг барацьбы і перамогшы ў цяжкай барацьбе з імпэрыялістычнымі драпежнікамі.

Ангельскі і амэрыканскі імпэрыялізм, які да апошняга часу прыкідваўся „сябрам" кітайскага народу,—зараз паказаў усяму сьвету і ў першую чаргу самому кітайскаму народу, свой сапраўдны твар.

Лепшым агітатарам супроць імпэрыялістых Англіі і Амэрыкі зьяўляюцца іх уласныя паводзіны ў Кітаі.

Ў момант, калі крывавая рука імпэрыялістых ўзьнята для новага ўдару па кітайскаму народу, калі жэрлы гармат, накіраваных на Нанкін і Шанхай, чакаюць загаду пачаць агонь дзеля таго, каб сеяць усюды сьмерць і зруйнаваньне,—заклікаем маладых рабочых усіх капіталістычных краін, і ў першую чаргу Англіі і Амэрыкі, сумесна з намі пасла́ць.


Тысячакратны праклён катам рэволюцыйнага нар'ду—душагубцам Вялікай Кітайскай Рэволюцыі.

— Працягнуць братнюю руку дапамогі кітайскаму народу.

Заклікаем.

Не страляць у кітайцаў, якія змагаюцца за нацыянальнае вызваленьне.
Не дазваляць выкарыстоўваць сябе у якасьці забойц кітайскага народу.
Сябраваць з салдатамі нацыянальнай рэволюцыйнай арміі.
Патрабаваць уводу узброеных сіл імпэрыялістых з Кітаю.
Разам з намі кінуць кліч:
Няхай жыве перамога кітайскай рэволюцыі!

Лёзунгі рэволюцыйнага Кітаю



Узварот Кітаю зьмешаных караблёў і між-народных капіталаў.

Дзёньнік конфэрэнцыі ЎсеЛКСМ

Нядзеля 27 сакавіка

Працягваюцца спрэчкі па дакладу Цэнтр. Камітэту. Выступыўшы тав. Мацьвееў (ЦК УсеЛКСМ) удзяліў асаблівую ўвагу пытаньню рацыяналізацыі вытворчасьці.



Тав. Чаплін.

Іваноў (МК УсеЛКСМ), спыніўся ў першую чаргу на дзеле комсамольскай організацыі ў барацьбе за паляпшэньне дзержапарату і супроць бюрократызму.

Выступаўшы т. Ханін згаджаецца з асноўнай думкай Мацьвеева аб тым, што рацыяналізацыя вытворчасьці ў значнай ступені азначае зьмест і характар працы саюзу на бліжэйшы шэраг гадоў.

Старшыня т. Собалеў агалашае прапанову прыняць рэзолюцыю протэсту супроць бамбандыроўкі Нанкіну. Зачытаная т. Хітаровым рэзолюцыя протэсту прымаецца аднагалосна.

На вячэрнім пасяджэньні працягваюцца спрэчкі па дакл. ЦК т. Чапліну прадстаўляецца заключнае слова.

Для складу рэзолюцыі па дакладу ЦК утвараецца камісія ў складзе 45 чалавек. Гэтай жа камісіі даручаецца выпрацоўка рэзолюцыі па пытаньню аб барацьбе з бюрократызмам.

Панядзелак 28-е сакавіка

Раніншняе пасяджэньне адчыняецца дакладам тав Шацкіна аб працы дэлегацыі ЎсеЛКСМ у КІМ'е.

Па дакладу адчыняюцца спрэчкі. Першы атрымоўвае слова т. Хітараў.

У абгаварваньні працы расійскай дэлегацыі ўдзел прымаюць т. т. Карымаў, Паўлаў, Бухарцаў, Куцепаў, пасьля чаго адбываецца заключнае слова т. Шацкіна

Выбіраецца камісія ў складзе 9 чалавек для выпрацоўкі рэзолюцыі.

На вячэрнім пасяджэньні з дакладам аб піонэрпрацы выступіла т. Максіна. Яна ўказала на вялізарныя каранькі плоды, падараныя конфэрэнцыі падмаскоўным саўхозам у знак таго, што піонэры зьяўляюцца дзельнымі памочнікамі ў справе разьвіцьця сельскай гаспадаркі.

Увесь вечар ішлі спрэчкі.

К канцу прыбыла т. Крупская, якая прыняла ўдзел у абгаварваньні дакладу.

— Мне здаецца, — сказала Крупская, трэба піонэрскую працу зрабіць ярчэй. Ня толькі на сьвятах, спэктаклях і вечарох, кожны дзень, кожны будні піонэрскі дзень трэба зрабіць ярчэй, захапляючай.

Заключным словам тав. Максінай зачыняецца вячэрняе пасяджэньне.

29 сакавіка

Раняшняе пасяджэньне адчынілася дакладам тав. Ягорава аб удзеле комсамолу ў пад'ёме сельскай гаспадаркі і коопэрацыі.

Вечарам адбыўся даклад аб экономпрацы.

За дабраахвотнае аб'яднаньне

29 сакавіка закончыла сваю працу фізкультурная нарада пры ЦК ЛКСМБ.

Нарада заслухала даклад тав ЛЕВА аб практычных мерапрыемствах па фізкультруху.

Рэзолюцыя, прынятая па дакладу, адзначае, што недахопы, якія назіраюцца ў фізкультруху, зьяўляюцца вынікам супярэчнасьцяў між формамі кіраўніцтва і запатрабаваньнямі мас.

Нарада далучаецца да пастановы ўсесаюзнай фізкультурнай нарады пры ЦК УсеЛКСМБ аб стварэньні дабраахвотнага аб'яднаньня фізкультарганізацыі з адзіным кіруючым выбарчым органам. Рэзолюцыя адзначыла шэраг недахопаў у фізкультруху, як павольны тэмп узросту за лік рабочых і сялянскіх мас, слабая самадзейнасьць у большасьці гурткоў, адсутнасьць вылучэньня радавых фізкультурнікаў на актыўную грамадзкую фізкультурную працу, слабае разьвіцьце масавых форм працы па фізкультуры. Адзначаючы недастатковую працу па прыстасаваньню выкладаньня фізкультуры к нацыянальнаму складу займаючыхся, нарада лічыць, што ў бліжэйшы час трэба дабіцца: хутчэйшага перакладу фізкультурнай тэрміналёгіі на беларускую, яўрэйскую і польскую мовы, вывучэньня і культывіраваньня нацыянальных гульняў. Цэнтр цяжкасьці кіраўніцтва саюзу фізкультрухам павінен быць перакладзен на ячэйкі ЛКСМБ, для чаго у кожнай з іх як у горадзе, так і ў вёсцы з актыўных комсамольцаў, якія цікавяцца фізкультурай вылучаецца фізкультарганізатар, які ўводзіцца ў бюро ячэйкі.

Нарада таксама заслухала даклад тав. **Задорына** аб зьмесьце летняй працы і падрыхтоўкі да лета. **Замест працы ў гарадзкіх фізкульгуртках павінен адзначацца ў наступным: практыкаваньне спорту (лёгкай атлётыкі, плаваньня, грэблі, стральбы), гульняў (гантбол, футбол, ручны мяч, італьянская лапта, тэніс, ватэрпола), гімнастыкі, экскурсыі (пехатой, на лодках і зьмешаныя). Праца вясковага гуртка павінна складацца з спорту, гульняў (апошнія могуць зьмяняцца ў залежнасьці ад мясцовых умоў) скокі і гімнастыка.**

На нарадзе горача разгарнуліся спрэчкі з загадчыкам культаддзелу ЦСПСБ тав. **Конанавым** па пытаньню аб формах кіраўніцтва фізкультрухам.

У канцы была заслухана яшчэ інформацыя аб турызьме.

Р.

Гаспадар Меншчыны

2 зьезд Саветаў Менскай акругі

Пытаньні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва—у асяродку увагі комсамольцаў-сельсаветчыкаў.

Нашу энэргію перамножым на конкрэтнасьць!

(На адчыненьні 2-га Зьезду Саветаў Менскай акругі).

Вечарам 29-га сакавіка ў памяшканьні Дому Культуры распачаў сваю працу 2-гі Зьезд Саветаў Менскай акругі.

— Наш зьезд сабраўся—кажа тав. **Яцкевіч** пры адчыненьні зьезду,—у вялікія дні гісторыі рэволюцыі. На ўсходзе ў Кітаі, мільёны рабочых і сялян, якіх прыгняталі, эксплёатавалі чужаземныя імпэрыялістыя, пачынаюць рваць путы і вызваляцца з векавога ўціску.

За некалькі міль ад Менску, у Заходняй Беларусі гуляе на сьпінах беларускага сялянства бізун Пілсудзкага.

І гэта ў той час, калі наша Савецкая Беларусь, пры актыўным удзеле ўсяго насельніцтва, ажыцьцяўляе лёзунг комуністычнай партыі—гэта: краіну аграрную перавярнуць у краіну прамыслова-аграрную.

Што сказаў тав. Адамовіч.

Старшыню Саўнаркому БССР тав. Адамовіча зьезд спаткаў працяжнымі воплескамі. Перадаўшы прывітаньне ад імя Ураду БССР, тав. Адамовіч падкрэсьліў:

— «Барацьба з бюрократызмам, барацьба за добра працуючы савецкі апарат, зьніжэньне розьнічных цэн—вось задачы, над разьвязаньнем якіх працуем мы ў сучасны момант.

Наша сельская гаспадарка падымаецца, але вельмі ціха. Гэта нас не здавальняе, бо вёска яшчэ не атрымоўвае ад зямлі такіх ураджаеў, якія-б палепшылі дабрабыт сялянства, далі магчымасьць яму шпарчэй разьвівацца культурна. Нам трэба пашырыць тэхнічныя культуры, павялічыць таварнасьць вёскі і гэтым самым дапамагчы селяніну хутчэй пазбавіцца астачы царскай спадчыны.

Мы пішам шмат сур'ёзных рэзолюцый, але над выкананьнем іх, над правядзеньнем у жыцьцё пастаўленых у рэзолюцыях задач часта сур'ёзна ня думаем.

Некаторыя таварышы думаюць, што мы ня робім сусьветнай рэволюцыі. Такія погляды зусім памылковыя.

Тое, што мы ўзмацняем нашу савецкую краіну, узмацняем нацыянальную справу, павялічваем сьвядомасьць працоўных мас, пашыраем іх культурнасьць—гэта ёсьць усё тое, што называецца узмацненьнем сусьветнай социялістычнай рэволюцыі.

Узмацненьне нашага становішча—моцна непакоіць паноў «вялікай» Польшчы, асабліва ангельскага найміта пана Пілсудзкага.

Мы не пазбаўлены ваеннай небясьпекі. Гэта кожны ведае і гаворыць—«вайны мы ня хочам, але мусім быць на пагатове». Чаму беларускі селянін і рабочы ня хоча вайны?—Не таму, што ён баіцца, наадварот, а таму, што ведае няшчасьце ад вайны, перанёс гэта няшчасьце на сваім карку.

Часам Польша думае аб злучэньні з намі. Што-ж? Мы згодны злучыцца, толькі ня з панскай Польшчай а з Пролетарскай.

Пасьля прывітальных прамоў сакратара АК КПБ т. **Акуліка** і старшыні ЦСПСБ т. **Перапечкі** выступіла сялянка Койданаўскага раёну тав. **Яновіч.**

Яе словы перапоўнены шчырасьцю і ненавіджаньнем буржуазіі:

— «Перадаю вам прывет ад нашых вольных жанчын. Таварышы, яшчэ за кардонам за некалькі верст ад нашага Койданава, нашых сёстраў мучаць няшчасныя буржуі, зьдзекуюцца над імі... Дакуль гэта будзе?..

Смуглявая вясковая жанчына, якой прышлося ў часы вайны самой касіць і сеяць, і дзетак даглядаць, ведае смак жыцьця замежных сёстраў, калі іх мужы і сыны гніюць у турмах, а таму яна пад бурныя аплёдысмэнты зьезду разазьлёна праклінае панскае адродзьдзе.

*

У выступленьнях кожнага адчувалася: **«у нас энэргіі шмат, толькі гэту энэргію трэба перамножыць на канкрэтнасьць пастаўленых задач».**

Комсамолец-дэлегат.

Між дэлегатамі-комсамольцамі

Аўторытэт комсамолу ў вёсцы з кожным днём узрастае. Пацьвярджэньнем гэтаму можа служыць хоць-бы і выбары комсамольцаў у сельсаветы, даручэньні ім розных адказных прац.

Дэлегатка зьезду т. Захарэвіч.

На 2-гі зьезд Саветаў Менскай акругі таксама прыехала шмат комсамольцаў—актыўных сельсавецкіх працоўнікоў. Наш корэспондэнт меў з некаторымі з іх гутарку аб гаспадарчым і культурным будаўніцтве вёскі.

Што яны сказалі?

Сіманчык Уладзімер
(Старшыня Жодзінскага сельсавету, Смалявіцкі р.)

— Старшыня і сакратар сельсавету—комсамольцы. Пасьля перавыбараў мы энэргічна ўзяліся **за ўтварэньне таварыства па агнятрываламу будаўніцтву.**

У Жодзіне адбыўся нарэшце гэтага агульны сход. Пасьля сходу чалавек **20 запісалася** ў сябры таварыства.

Моладзь вёскі Градкі, організаваная ў гурток «Прыхільнікаў газэты» жадае шляхам апрацоўкі паказальнага вучастка **навучыць сялян культурнай апрацоўцы зямлі.** У гэта ім дапаможа сельсавет.

Тав. Шылай
(Голацкі сельсавет, сакратар ячэйкі)

— З надыходам вясны ў хаце-чытальні амаль кожны вечар праводзяцца гутаркі аб карысьці ачысткі насеньня. Ужо некалькі тыдняў працуе пры поўнай нагрузцы зерняачысьціцельны пункт.

Рыхтуем нараду бацькоў піонэраў. Гэтым мы хочам прыцягнуць бацькоў да працы па зьнішчэньню у дзяцей хворых момантаў (курэньне, п'янства, кляцьба і г. д.)

Дагаварваемся з шэфам (менскія больніцы) аб мэдыцынскім аглядзе піонэраў. Дзіцячая консультацыя дала на гэта сваю згоду.

Тав. Маслоўскі
(Сакратар Смалявіцкага Райкамолу)

— За апошнія месяцы значна павялічыўся ўдзел комсамольцаў-сельсаветчыкаў у справе разьвязаньня конкрэтных пытаньняў гаспадарчага будаўніцтва.

Член Амельянаўскага сельсавету тав. Караленка організоўвае бычачае таварыства. Праведзена ўжо кампанія па збору сродкаў.

Воратаўскі сельска-гаспадарчы гурток, якім кіруе комсамолец **Пятроўскі Мікола**, атрымаў прэмію ў 50 руб. За гэтыя грошы куплена сячкарня, якой карыстаюцца сяляне ўсяе вёскі.

Скурацкая комсамольская ячэйка ня толькі праводзіць працу за палепшаньне комсамольскіх гаспадарак, але і прышчапляе насельніцтву пачыны колектыўнасьці. Ёю утворана комсамольская арцель з 6 чалавек. Арцелі адпушчана 24 дзесяціны зямлі.

Пры Жодзінскай хаце-чытальні маецца харавы гурток, у якім працуе 45 чалавек моладзі. Кіруе гуртком настаўнік. Праз харавы гурток дзяўчата ўступаюць у шэрагі комсамолу, харавы гурток працоўвае у масы моладзі новыя песьні.

Абмётка Янка
(Старшыня Азярыцка-Слабадзкога сельсавету)

— Пры разьмеркаваньні дармовага лесу зьвярталі асаблівую ўвагу на беднату і на сялян, якія перашлі на пасёлкі. Таксама беднаце і насеньне ачышчаецца дарма.

У вёсцы Дынараўцы хутка пачне працаваць малочная арцель, якая будзе сялянскае малако перапрацоўваць на сыры і масла, з мэтай больш выгаднага збыту яго ў горад.

Як жыве і будуецца СССР.

Народная гаспадарка БССР.

Саўнаркомам БССР заслуханы даклад Дзяржпляну аб 5-цігадовым пэрспэктыўным пляне народнай гаспадаркі БССР.

Пасеўная плошча ў рэспубліцы ў 1930-31 годзе будзе раўняцца 3.273 тысячы дзесяцін і павялічыцца за 5-цігодзьдзе на 23 процанты. Мяркуецца павялічэньне пасеўнай плошчы тэхнічных культур на 70 процантаў і ўзмацнёнае разьвіцьцё сьвінагадоўлі і буйнай жывёлагадоўлі. Валавая продукцыя сельскай гаспадаркі павялічыцца з 629 мільёнаў рублёў да 890 мільёнаў рублёў пры зьніжэньні цэн па асобным відам продукцыі да 15 процантаў.

Асабліва значнае месца адведзена ў пляне пытаньню індустрыялізацыі БССР. Вызначаецца да пабудовы шэраг буйных прадпрыемстваў ільнапрадзільнай, ільнаткацкай, дрэваапрацоўчай, папяровай, шкляной прамысловасьці, па вырабу сельска-гаспадарчых прылад і машын і г. д. Разьвіцьцё прамысловасьці зьвязваецца з буйным электрабудаўніцтвам у раёне гораду Оршы (Асінаўская раённая станцыя). Рост валовай продукцыі цэнзавой прамысловасьці вызначаецца ў 120 процантаў.

Капітальныя затраты ў прамысловасьці вызначаюцца за пяцігодзьдзе ў суме каля 100 мільёнаў рублёў, з іх 56 мільёнаў рублёў будуць пакрыты з бюджэту. На электрафікацыю мяркуецца патраціць да 30 мільёнаў рублёў. Асыгнаваньні на вытворчыя мэты ў сельскай гаспадарцы азначаюцца ў 65 мільёнаў рублёў.

Рост усяго тавараабароту вызначаны ў 43 процанты. У гандлёвым звароце мяркуецца амаль поўнае выцясьненьне прыватніка з аптовага гандлю і зьніжэньне яго удзельнай вагі ў розьніцы з 45 процантаў у гэтым годзе да 30 процантаў у 1930—31 годзе. Звароты ўсёй коопэрацыі ўзрастуць за пяць год з 163 мільёнаў рублёў у 1925-1926 г. да 318 мільёнаў рублёў у 1930-31 годзе

Дзяржаўны бюджэт узрасьце з 56 да 84 мільёнаў руб., мясцовы—з 40 да 53 мільёнаў рублёў.

Індустрыялізацыя Беларусі.

У красавіку ў Беларусі пачнуцца працы па пабудове новых і рамонту працуючых фабрык і заводаў. ВСНГ Беларусі вызначае зараз пабудову новага шклянага комбінату ў Гомельскай акрузе, дзе ёсьць вялікія залежы торпу і крэйды. У Бабруйску аднаўляюцца працы па пабудове вялікага дрэваапрацоўчага комбінату. У Рэчыцы будуецца новая сярнікавая фабрыка. Вызначана пашырэньне амаль на 100 проц. гвазьдзільнага заводу «Інтэрнацыянал».

У Менску прадаўжаецца пабудова новага скуранога заводу і пераабсталяваньне хромадубільнага. Завод будзе пушчаны к 10-цігодзьдзю Кастрычнікавай рэволюцыі.

Акрамя таго, Саўнарком ухваліў пачаць пабудову ў Віцебску новага маслабойнага заводу. Белскуртрэст вядзе дасьледчыя працы па пабудове заводу дубільных экстрактаў.

Адначасова з гэтым будуюцца прадпрыемствы мясцовага значэньня. У рэчыцкай акрузе будуюцца 5 заводаў па перапрацоўцы прадуктаў сельскай гаспадаркі, 5 сыравараных, 1—крахмальны і 1 цэглавы завод. У ваколіцах Менску закончваецца пабудова вялікага крахмальнага заводу. У Менскай акрузе ў гэтым годзе пачнецца пабудова цэмэнтнага, вапняковага і некалькіх цагляных заводаў. Каля Жлобіну на беразе Днепра будуецца вялікі цагляны завод.

Новыя электрастанцыі на паўночным Каўказе.

У працягу мінулага году ў краі будзе закладзена і пабудавана некалькі новых электрастанцый. Першага красавіка закончыцца пабудова гідроэлектрастанцыі ў сяленьні Акбаш у Кабардзе. Вясной пачнецца таксама пабудова вялікай групавой станцыі ў Матвеева-Кургане. Заканчваецца таксама дасьледчая праца па пабудове вялікай групавой электрастанцыі на лініі Хоста-Мацэста-Сочы-Адлер. Акрамя таго, вызначана пашырэньне шэрагу маючыхся станцый.

Новы горад у Казакстане.

У 80-ці верстах ад Алмааты, на беразе возера Балхаш, ва ўрочышчы Курты, будуецца паказальны горад для казакскага насельніцтва. У горадзе ўжо пабудаваны школа, бальніца, вэтэрынарны пункт і многа жылых мяшканьняў. Горад павінен спрыяць пераходу вандроўнікаў на аседласьць.

Мы змагаемся ня з веруючымі, а супроць веры.

Ячэйкі, рыхтуйцеся да вялікадню!

[К]ожная ячэйка павінна настойна змагацца, з камандваньнем з адміністрацыйнымі мэтадамі ў антывялікоднай кампаніі.—Трэба да гэтай кампаніі [да]сканальна падрыхтавацца: пытаньне аб вялікадню прапрацаваць на ячэйках, гуртках, „бязбожнікаў“, добра падрыхтаваць даклад, інсцэніроўку, скарыстаць малюнак, музыку ў антырэлігійнай працы.

Пара рыхтавацца!

У сёнешнім нумары мы друкуем ма[тар']ялы антырэлігійнай пропаганды ў [су]вязі з надыходам вялікадня.

Комсамольская ячэйка, кожны комса[мол]ец, павінен раней за усё ўявіць пы[тань]не аб мэтодах - г. зн. аб тым, як [весь]ці антырэлігійную працу, як тое ці [інша]е пытаньне растлумачыць маладому, [раб]очаму, селяніну, сялянскай дзяўчыне, [піянэ]ру.

Патрэбна раз на заўсёды—ўявіць, што [мы] змагаемся ня з веруючымі, а супроць [веры]. Кожная ячэйка павінна настойна [змаг]ацца з камандваньнем, з адміністра[цый]нымі мэтадамі ў гэтай складнейшай [пра]цы. Не рабіць глупства—ня значыць [нічог]а не рабіць. Антывялікодную кампа[нію] мы павінны правесьці, да яе трэба [дас]канальна падрыхтавацца.

Пытаньне аб вялікадню трэба раней [за ўс]ё на нашым матар'ялам прапрацаваць у комсамольскім асяродку, на ячэйках, у гуртках «бязбожнікаў» з тым, каб комсамольца падрыхтаваць да індывідуальнай пропаганды сям'і, сярод моладзі.

Дасканальнейшым чынам павінны рыхтавацца к дакладам нашы дакладчыкі. значэньне конкрэтнага матар'ялу, яго разнастойнасьць, неабходнасьць прыстасаваньнь да узроўню разьвіцьця і характару аўдыторыі. Усё гэта павінен уявіць кожны пропагандысты антырэлігійнік.

Скарыстаць малюнак, плякат, дыапазытывы, інсцэніроўкі, музыку у антырэлігійнай працы, значыць адцягнуць моладзь ад царквы, ад п'янкі і мардабойства у сьвяточныя дні, што для нас вельмі важна. Ячэйкі павінны адразу прыступіць да падрыхтоўчай працы. Ад прадуманай падрыхтоўкі залежыць поспех антывялікоднай кампаніі гэтага году.

Ці быў Хрыстос?*

Што кажа евангелія аб Ісусе Хрысьце.

[К]аб збавіць людзей ад першага граха, [...]у і сьмерці «ў дні оны» гасподзь пасл[аў] на зямлю адзінароднага сына [св]аго народжанага непарочнаю дзевай [Мар]ыяй ад сьвятога духа, які выкупіў чалавецтва сваімі мукамі.

Нарадзіўся сын божы ў Віфлееме Іўдэйскім, у ясьлях. На паклон да яго [прый]шлі ня толькі віфлеемскія пастухі, [але] і валхвы (мудрацы), з Усходу, якія [пры]нясьлі яму золата, ладан і сьмірну [(пах]учае масла).

Эгіпецкаэ боства.

[П]раслухаўшы аб нараджэньні новага [іўдз]ейскага цара, кіраваўшы Іўдзеяй цар [Ірад] спалохаўся, што яго месца можа заняць другі, а загэтым загадаў у адзін [дзень] зьнішчыць усіх зноў народжаных [віфлеа]мскіх дзяцей. І было зьнішчана іх [...]00. Але дзіцё Ісус не загінуў ад рук [за]бойцы. Анёл господні зьявіўся у [сьне] мужыку Марыі—цесьлю Язэпу і [загад]аў яму тайком уцякаць з дзіцем у [Эгіпэт] і жыць там, пакуль не памрэ цар [Ірад]. Гэтак і было зроблена. Аб гэтым у [той] час гаварылі даўно памёршыя пра

Ці можна верыць евангельскаму апавяданьню.

[В]а ўсіх гэтых апавяданьнях—на[д]-[м]ат цудоўнага, а ў цуды мы ня ве[рым]. Але каб у тыя часы было тако[е зьбіцьц]ва дзяцей і іншыя цуды Ісуса, [т]о аб іх абавязкова успамянулі-б сучас[нікі] Ісусу яўрэйскія (Філон, Язэп, Флавій [...]с з Цівэрлады) пісьменьнікі, талмуд [(свя]ая кніга яўрэяў), грэцкія і рымскія [пісьменьн]ікі. Але даказана, што ўсе тое [што н]апісана аб Ісусе—пазьнейшыя вель[мі ня]умелыя ўстаўкі. Не адзін сучасьнік [Хрыст]а не гаворыць аб ім. Мала гэтага, [...]ыя ня вераць існаваньню ў той час [Назар]эту, паказваючы што перапіс рабілі [...]6 год пасьля нараджэньня Хрыста. [Гэ]та быў просты падворны перапіс, [і таму] не зачым было ісьці з Назарэту [у Віфл]еем, што евангелістыя нарочна [падтас]авалі факты, каб даказаць, што [чакан]ы яўрэйскімі гушчамі мэсія і Ісус—[гэта] і тая-ж асоба, што цар Ірад памёр [за 4 г]ады да нараджэньня Хрыста, што [аб ім] і гаварылі пракокі.

[Байк]і аб непарочным зачацьці Ісуса запазычаны ў [бол]ьш старадаўніх народаў.

[Б]айкі аб Ісусе пазычаны ў больш старадаўніх народаў і ўсе яны былі за некалькі сот альбо тысячы год да нараджэньня Хрыста.

Гэтыя байкі аб непарочным зачацьці адбіваюць барацьбу за пяршынство ў сям'і мацеры і бацькі. Жадаючы паменшыць ролю мужчыны ў сям'і, жанчыны расказалі, што і яны могуць раджаць дзяцей без дапамогі мужчыны—непарочнае зачацьце. З свайго боку, мужчыны гаварылі, што яны могуць раджаць мужчын без дапамогі жанчын.

Грэцкі бог Юпітэр нарадзіў з свае галавы Мінэрву, багіню мудрасьці. Эгіпэцкі бог Усум зьнёс ротам яйцо, з якога нарадзіўся Фта—бацька Зорак. Без жанчын нарадзілі багі Орыона і г. д. (Глядзі «міф аб непарочным зачынаньні» ў зборніку Лафарта «На капіталістычнай катарзе»).

Але-ж з-за чаго верылі гэтым байкам гушчы народу? Ды таму, што цяжка жылося ў даўнейшыя часы земляробам. Надта ўжо моцна залежаў ён ад стыхыйных сіл прыроды, і ад волі прыгнятаўшых яго багацеяў, кулакоў і папоў. Разрозьненыя, цёмныя, пражываўшыя на мяжы зьвярынага існаваньня, змучаныя цяжкай працаю, далёка адзін ад другога жыўшыя земляробы не маглі спадзявацца сваімі ўласнымі сіламі збавіцца ад прыгнёту багацеяў. Яны чакалі збавіцеля ад багоў, чакалі збаўленьня ад збавіцеля. Ва ўсіх народаў знаходзім мы падобныя байкі аб багох, якія памучыўшыся адзін раз за людзей другі раз зьявяцца на зямлю і ўстановяць на ей «залаты век», калі свабодна ўздыхне ўсякі змучаны, прыгнечаны патрэбаю, калі па завярэньню пракокам Ісаіяй мячы будуць перакаваны на мірныя рэчы і леў будзе спаць разам з ягнём. Надзея на тое, што хутка прыдзе збавіцель, надзея на радаснае жыцьцё ў залатым веку і памагала сялянам і рабом цярпліва зносіць сваю цяжкую долю. Але зачым-жа нараджэньне Хрыста сьвяткуецца 25-га сьнежня? Д[а]-затым, што ў гэты час сонца паварачвае зімы на лета.



Багі асірыйцаў.

Такім чынам апавяданьне аб непарочным зачацьці Хрыста—пяўторанае выданьне больш старадаўніх сказаньняў. Зразумела адсюль, што і падрабязнасьць нараджэньня запазычана.

Пэрсыцкі Мітра нарадзіўся ў пяшчэры і яму пакланяліся пастухі.

Грэцкі Зэўс радзіўся ў пяшчэры Іда ад багіні Рэі—іх прасьледуе Кронас. Эгіпэцкая Ізіда раджае Горуса на востраве. Іх прасьледуе Ціфон.

У аднэй з адкапаных у Анцыну опаліге (Эгіпэт) магіл знойдзены ясьлі, ужываўшыеся для прадстаўленьня сцэн з жыцьця Азіруса, надта напамінаючыя нам «верцеп».

У эгіпэцкіх фівах над самым Нілам знаходзяцца руіны вялікай царквы Аммона, якая мае так званую каплічку нараджэньня, дзе ў барэльефах адбіта сцэна эпохі, калі неба зносілася з зямлёй і ствараала бога—людзей.

Вядома, таксама гісторыя пабегу ў Эгіпет і звароту адтуль. На адным з пацямнеўшых малюнкаў Помпэі мы бачым Ізіду сядзячай з маленькім Горусам на ясьлях. Калі нарадзіўся маленькі Бахус, яго палажылі ў пляцёнку.

Сходзтвы Будды з Ісусам.

Але больш усяго сходзтва Хрыста з Буддаю, які жыў за 500 гадоў да Хрыста, (калі наогул Хрыстос калі небудзь жыў).

Будда рашыў спусьціцца на зямлю і дзеля гэтага выбраў сонечны род Сакію, з якога ён павінен зьявіцца. Ісус таксама царскі род.

Будучая маці Будду царыца Мая бачыць прароцкі сон, з якім зьвярнуўся да Марыі архангел Гаўрыил ў час благавешчаньня. Нараджэньне Ісуса і Будды абвяшчаецца зоркаю, абодвы новароджаныя атрымоўваюць гасьцінцы.

Ісус шукае Іоана як вучыцеля. Будда шукае Рудрака. Вучні Іоана становяцца вучнямі і Ісуса. Вучні Рудрака—вучнямі Будды. У абодвых па 12 вучняў і адзін—здраднік. Пры пагружэньні Ісуса ў Іордан адбылося надзвычайнае зьяўленьне, такое зьяўленьне робіцца пры ўваходзе Будды ў раку Найрандусан. Ісус ідзе ў пустыню і там посьціцца. Тое-ж і прарабляе і Будда. Ісус тры разы спакушаецца—д'яблам, а Будда спакушаецца дэманам Мара праз пасрэдства трох дачок. І там, і тут д'ябал патрабаваў пакланеньне, абяцаў узамен уладу над мірам. І тут, і там, анёлы пасьля ўдаленьня спакусьніка прыслугоўваюць перамогшаму мэсіі. Ёсьць сходзтвы і ў вывучэньні абодвых з гары блажэнства. І там, і тут, у момант сьмерці, робяцца цуды землястрасеньня. Абодвы робяць лячэньне, абодвы абвяшчаюць царства божае. Абодвы ходзяць па вадзе і ў кожнага адзін з вучняў таксама ідзе па вадзе і ў выпадку няверя тапіцца. Абодвы ўзносяцца на неба.

*) Артыкул друкуецца ў значна скарочаным выглядзе.

Навука перамагла рэлігію

Але людзкі розум упарта імкнуўся зразумець акружаючае, уведаць кіруючыя сьветам законы. Праходзілі вякі, і кожнае сталецьце прыносіла што-небудзь новае ў галінах прыродазнаўства гісторыі, культуры. Спачатку чалавек усумніўся, ці зьяўляецца зямля цэнтрам усяленнае, вакол якой ходзяць сонца і зоры, а потым

«Мошчы» у рачаістасьці.

і даказаў, што зямля ёсьць пяшчынка ў сусьветным абшары, якая носіцца навокал сонца, што само сонца носіцца навокал сусьветнай восі, што зямля стварылася самым звычайным шляхам, ня ў 6 дзён, як гаворыць біблія, а ў сотні мільёнаў год, што чалавек найвышэйшая ступень у разьвіцьці жыцьця на зямлі, што вянок тварэньня зьвязан радством з усімі ніжэйшымі жывёламі.

Р. Ш—ч-Т—ў.

Васкрэсеньне багоў.

Вера ў васкросшага Хрыста была на руку багатым.

Звыш паўтары тысячы год хрысьціянскае духавенства ўсіх масьцяў пісала «бога натхненыя» навучэньні аб муках [с]ышоўшага на зямлю сына божага Ісуса Хрыста, сваімі мучэньнямі, як-бы выкупіўшага людзей ад таго праклёну, якому [п]адвёрг у дні оны бог-бацька Адама і [Е]ву за тое, што яны ў райскім садзе зьелі забароненае яблыка.

«Іскупіл ны есі ад клятвы законнае (?!) чэснаю тваею кроўю, на крыжы [п]рыгвазьдзіўся і копіем прободся, бясьсьмерціе источыл есі чалавеком»,—слава[с]лавіць Хрыста ў вялікую пятніцу праваслаўнае духавенства.

Царкоўнаму кліру ня раз натхнёна [пад]тарылі буржуазныя поэты і пісьменьнікі, [у] прозе і вершах апісваючы апошнія дні [з]ямнога жыцьця сына божага.

А пад шум песьняпеваў дасужых піітаў, [р]ымскі папа абярнуў гэтыя мукі ў да[х]одную для сябе стацьцю; Хрыстос так [ш]мат выцярпеў, што выкупіў сваімі му[к]амі грахі людзей і папа гандляваў ад[п]ушчэньнем грахоў цяперашніх, мінулых [і] будучых.

«Хрыстос цярпеў і нам вялеў»—ву[ч]ылі папы сваю паству.

— Прыдзіце да мяне ўсе працоўныя прыгнечаныя і аз супакою вас—прызывае Хрыстос беднякоў устамі евангэлістых. [І] цягнуліся к быццам-бы замучанаму на [к]рыжы Хрысту ў гарачым маленьні мільёны працоўных і прыгнечаных.

А багацеі, пануючыя клясы, забыўшы, што лягчэй вярблюду прайці праз ігольнае вушка, чым багатаму папасьць у царства нябеснае, пад гук званоў, карміўшых папоў, жылі ў роскашы ў той час, як бедната зьнемагала ў гарачым маленьні збавіцелю.

Вялікоднае.

Як вялікадня прыждаў,
Янка стаў нудзіцца:
Паўрубля-б якога даў,
Каб дзе сёньня ўпіцца.
— Добры вечар, брат Сымонка!
— Добры вечар! Вельмі рад.
— Калі маеш самагонку,
— Дык прадай мне, мілы брат.
— Ну чаму-ж не, мне-бы грошы,—
Адказаў мілы Сымон:—
Самагон-жа мой харошы,
Проста сьпірт—не самагон!
— Ну, ня дарма. Заплачу я,
Толькі добрае давай,
Адно сёньня піць хачу я,
Хоць лажыся памірай.
Даў Сымон яму гарэлку,
Той барждзэй, як мог
Спаражніў усю бутэльку,
Заплаціў ды за парог.
Не дашоў ён і да дому—
Стала млосна тут яму,
Пад уплывам самагону
Паваліўся на зямлю.
Ляжыць, бедны небарака,
Аж вантробы з яго рве,
Ліжа рот яму сабака,
А сьвіньня—штаны дзярэ.
Вышла жонка—зірк за вугал
Ляжыць Янка, штосьці з ім.
Твар дык чорны—проста вугаль,
Аі з рота нібы дым.
Сэрца ў жонкі з цяжкай мукі
Ледзь ня вырвалась з грудзей,
І, яна зламаўшы рукі,
Стала зваць к сабе людзей.
— Людзі, добрыя, ратуйце!
Янка мой нібы гарыць;
Людзі, крык гэты пачуўшы,
Хто як можа так бяжыць.
Ну, прыбеглі. Што такое,
Як даць раду, што рабіць?
Ці ляжыць мо' хай спакойна,
Ці то даць яму што піць?
Тыя труць, а тыя кажуць:
Што тут лепей, што тут горш;
А другія проста кажуць
Мала выпіў—трэба больш!
Як прышоў знахар Хвядос,
Раду скора той знашоў;
Ён „паставіў дыягноз“,
„Мадыкамант“ Янку даў.
Тады людзі ў рот і вочы
Сталі тое ліць яму,
Што лье кожны пасьля ночы,
У загуменьні на зямлю.
Янка бедны, Янка бедны,
Каб пры памяці ён быў,
Век ня піў-бы таго зельля,
Лепш памёр-бы, а ня піў.
Выбачайце, дзядзькі й цёткі,
Мо' ўгнявіў я крыху вас,
Што прапеў кароткі гэты,
Шчыр-праўдзівы вольны оказ.

П. Корзун.

Бывае здарэньне.

(Малюнак).

Вялікдзень.

Радуецца поп Сяргей, будзе што ў кішэню палажыць. Кішэня-ж яго — а-яй! [Н]я толькі ўлезе гарнец самагонкі, але і [с]ам самагоншчык бадай схаваецца. Мась[л]яцца папа вочкі, пхае ён у кішэню ўсё, [ш]то даюць яму людзі набожныя...

Радуецца поп сьвяту. З самага раньня швэндаецца ён з хаты ў хату. „Вялікдзень дае».

— Хры-ы-стос ва-а-скрэ-е-э з ме-э-рр-твых,—хрыпіць п'яным голасам поп: [і] су-у-шчых во-о гро-о-о-бех жывот да-а-[р]аваў... З гэтымі словамі ён уваліўся ў [х]ату к кулаку Зьмітру.

— Дзень добры... ік... у хату... Ці да-а-азволіце... ік... ва-ам вялікдзень даць?..

— Дык вялікдзень, бацюшка, надышоў! Вось, не пазбаўце нас сваёй увагі, —прамовіла гаспадыня, - сядайце, калі [л]аска...

— Але, але, сядайце, айцец Сяргей! Мы дзеля вас асобную чарачку прыгатавалі,—схамянуўся гаспадар, падносячы з самадавольнай усьмешкай кубак, які прынамсі, шклянак са тры ў сябе зьмяшчае.

— Будзьце ласкавы, паспытайце гэтай вадзіцы, — заварушылася кабета,—прабачайце, што ўжо гэтак прынялі. Бачце, несцадзеўкі ўсё рабілася.

Гаспадар мой недарэка, трохі прыпаліў, але ўжо прабачайце, бацюшка.

— Ні-і-і-чога!—сказаў поп, скасіўшы вока на пляшку:—не па-а-брэзгуем... і грузна апусьціўся на лаўку, каб прыняцца за «трапезу».

Раптам пачуў ён, што нешта мокрае, ліпкае пацякло ў яго па сьцягну.

Што гэта?

І тут толькі ён сьцяміў, што кішэня з яйкамі схіснулася на бок і ён зьнянацку сеў на яе.

— Ух, маць тваю хрысьці:—Злосна прабармытаў поп і падумаў: «І які-ж гэта дурань у вялікдзень яйкі сырыя дае!? Вось, як тут быць? Не сядзець-жа на гэтым праклятым месцы ўвесь дзень» і, прыкрыўшы рукою пляму, нічога не гаворачы, пасунуўся на двор.

— Пачакайце, бацюшка! Куды-ж вы? Хіба дурна зрабілася?!—зьдзіўлена спытаўся гаспадар і, прыкмеціўшы, што чамусьці бацюшка трымаецца ззаду рукамі прамовіў, як-бы сьцяміўшы прычыну:

— А-а-а-а! Ну дык ідзеце! Там, выходзячы на двар. За пуняй...

З сорамам вышаў поп на двор.

— Што рабіць? Ісьці да дому, ды ня прыкрываючы плямы, сорамна. А яна ўселася вялікім кругам, і наводзіла чалавека на няпрыемную думку.

Думаў поп:—Няма ніякай рады.

— Хіба пазваць гаспадара?

— Э-э-э! — Усміхнуўся гаспадар:—дык вось яно што? Так, так... А я думаў... і, ня скончыўшы думку, пачырванеўшы, прамовіў:—Ну, гэта не бяда! Вы пойдзеце вунь у той пакойчык, пакуль мая Тадора ня вымые плямы і не прасушыць.

Сядзіць поп у маленькім пакойчыку ў споднай бялізьне.

Гаспадар прынёс яму гарэлкі і закускі.

— Пеце, бацюшка, на здароўе,—пакланіўся гаспадар, вось вам і вятчынка, вось і піражкі. Уяўляйце сябе, як дома!

Айцец Сяргей матнуў, як асёл, галавой і, бласлаўляючы, сказаў: — От дзе ёсьць, ча-а-адо сьмі-і-і-рэннае! Старыцай табе бог ва-а-здасьць... ік... да бла-а-славіць бог во ца-а-рсьцьвіі сваім.

У апошніх словах пачаў блытацца і, бяспомацна схіліўшы голаву на грудзі, падставіў к губам Зьмітра тлустую руку.

— Ідзі, чадо... мае... кумпанію па-а-цяшай... ік... ва імя... ва-а-скрасэньня... хры-ы-стова... А я тут... за цябе... богу... ік... па-а-а-амалюся...

Гаспадар вышаў.

«От дзе жыцьцё!» падумаў пра сябе поп, прымаючыся за «працу». І, напіўшыся да няпрытомнасьці, зусім забыўшы свае становішча, вышаў, хістаючыся, на вуліцу.

— Унь, бацюшка ў нагавіцах!

— Палядзі, палядзі!

— А дзе яго спадніца!?

— Хрысто-ос васкрэ-эсе,—мармытаў поп, благаслаўляючы дзяцей, якія рагочучы, пазіралі на яго.

— Бацюшка, о, бацюшка! Зайдзеце ў хату,—прасіў Васіль—барадаты мужык цягаючы папа за руку.—Гэтак няхораша! Бачыце, дзеці сьмяюцца!

А вы, падшывальцы, вон адсуль! Марш па хатах!

— Хры-ы-ы-стос... ік... ва-скрэ-э-се-э-э—заводзіў поп.

Мужык вучыць папа. Ня трэба, ён і так разумны.

Р. Камлыга і
А. Ланіч.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

(у ЦК ЛКСМБ).

Абсьледваньне Рэчыцкай організацыі

У хуткім часе ЦК ЛКСМ праводзіць абсьледваньне Рэчыцкай комсамольскай організацыі.

Абсьледваньне будзе праводзіцца па пытаньням: праламленьня дырэктыў ЦК УсеЛКСМ аб саюзным кіраўніцтве, гаспадарчай і грамадзкай працы, правядзеньня нацполітыкі партыі, культурна-масавай працы і экономпрацы.

Даклады для моладзі.

Згодна пастановы ЦК ЛКСМБ Менскім Акругкомам комсамолу будзе праведзен шэраг публічных дакладаў для моладзі Менску па наступным пытаньням: 1. **Нацполітыка і ЎсеКП; 2. Культурнае будаўніцтва БССР і нацполітыка; 3. Партыя і моладзь; 4. Бюрократызм і барацьба з ім; 5. Барацьба за новы быт; 6. Аб становішчы ў Кітаі; 7. Літаратурны дыспут.**

Для дакладаў будуць прыцягнуты лепшыя партыйныя і навуковыя сілы Менску.

На нараду ў Маскву.

Хутка ў Маскве будзе скліканы ўсесаюзная нарада прадстаўнікоў моладзі ў профсоюз працаўнікаў мастацтва. На нараду ад Беларусі выяжджае тав. Гарэлік.

Ці выкананы дырэктывы ЦК?

У сучасны момант ЦК ЛКСМБ праводзіць праверку выкананьня дырэктыў ЦК у Калінінскай комсамольскай організацыі. Абсьледваньне праводзіць інструктар ЦК тав. Драпкін.

Піонэр у школе

ЦК ЛКСМБ і Наркамасьветы разаслалі мясцом дырэктыву аб падвядзеньні вынікаў зімовай працы піонэраў у школе. Дзеля гэтай мэты ў гарадзкіх школах будуць праводзіцца спэцыяльныя нарады фарпостаў сумесна з настаўнікамі, агульныя сходы вучняў па школах і г. д.

Адначасова ў дырэктыве зьвернута ўвага на неабходнасьць нормальнага наведваньня школ піонэрамі да канца вучэбнага году.

Выпуск школ

Наркамасьветы распрацаваў парадак выпуску з 7-мі і 9-ці гадовых школ і школ сялянскай моладзі.

Дзеля правядзеньня—залікаў і наогул выпуску, пры школах організуюцца спэцыяльныя камісіі ў складзе прадстаўнікоў акрана, комсамолу, школьнага савету і іншых зацікаўленых організацый.

* * *

Сёлета вучні, скончыўшыя сямігодкі пры паступленьні ў тэхнікумы (на І курс), ня будуць падвяргацца прыймовым іспытам.

Сёлетні прыём у тэхнікумы будзе залежыць галоўным чынам ад соцыяльнага **становішча** кожнага ўступаючага.

Падрыхтоўка да мэдагляду.

Народны Камісарыят Аховы Здароўя распачаў падрыхтоўку да мэдыцынскага агляду рабочай моладзі, які адбудзецца ў красавіку месяцы. На правядзеньне агляду адпушчана каля 3000 рублёў.

Першая польская школа.

У гэтым годзе будзе організавана першая ў БССР польская школа сялянскай моладзі. Намечана яе адчыніць у Менскай акрузе.

Колёнія бяспрытульных.

Цэнтральная камісія дапамогі дзецям організуе ў Магілеўскай акрузе буйную сельска-гаспадарчую колёнію для бяспрытульных, якая разьлічана на 150 чал.

Магілеўскі акрвыканком прадастаўляе ў распараджэньне колёніі двохпавярховы дом, адпаведныя будынкі і 60 дзесяцін зямлі.

Пры колёніі будзе організавана сямігадовая школа і тры майстэрні для розных спэцыяльнасьцяй.

На організацыю гэтай колёніі ЦК помдзет адпусьціў 70 тысяч рублёў.

Сярод пісьменьнікаў

Усебеларуская фэдэрацыя

26-га сакавіка ў Менску адбыўся ўстаноўчы сход усіх літаратараў і пісьменьнікаў па пытаньню аб організацыі ўсебеларускае фэдэрацыі пісьменьнікаў.

Пасьля дакладу Цішкі Гартнага і жвавых спрэчак, сход выказаўся аднагалосна (пры трох устрымаўшых свой голас), за фэдэрацыю.

Абрана часовае організацыйнае бюро, якое на працягу бліжэйшых дзён распрацуе асноўныя прынцыпы пабудовы фэдэрацыі.

„Узвышша“

○ Здадзен у друк другі нумар часопісі „Узвышша“, які выйдзе 1 мая. Нумар гэты, ў значнай сваёй частцы, прысьвечан 10-годзьдзю са дню сьмерці поэты **М. Багдановіча**.

○ У хуткім часе „Узвышша“ пачынае выдаваць творы сваіх сяброў пасобнымі зборнікамі. Зараз здаюцца ў друк наступныя кніжкі: **Краліва**—сатыры і новэлы, **Дубоўка**—вершы і зборнік мастацкай прозы—**З. Бядулі**.

У тры радкі:

○ Курсы па падрыхтоўцы працаўнікоў дзіцячых дамоў організуюцца хутка Наркомасьветай,

○ Гэтымі днямі Цэнтральная камісія дапамогі дзецям паслала ў дзіцячыя дамы 20 бяспрытульных.

А што ты зрабіў?

У чым—твой удзел у кампаніі па зьніжэньню цэн?

Комсамольцы прылаўка, дзе ваша ініцыятыва?

Раўняйся па №№ 20 і 40

Буйны магазын МЦРК № 59 на рагу Савецкай і Энгельса. Ля прылаўку мітусіцца комсамолка-прыкашчыца ў прыгожанькай касынцы.

Падыходжу, заводжу гутарку аб комсамольскім удзеле ў справе зьніжэньня цэн.

Кароткі, гіранічны адказ:

— Аб гэтым запытайся ў загадчыка... Я нічога ня ведаю...

У другім магазыне № 21 комсамолец-прыкашчык Шульц даў больш шчыры, але такі-ж як і папярэдні няўцеўшы адказ:

— У нас, братка, ні храна не праводзіцца... А чаму—сам ня ведаю...

Зусім іншыя словы, калі хлопцы зацікаўлены гарачай справай барацьбы за зьніжаную цану.

У магазыне № 20 комсамольцы правялі вельмі карысную і каштоўную працу: у першых лічбах сакавіка прышоў загад аб зьніжэньні. Трэба было выпісаць прэйс-курант па накладным, а для гэтага даведацца аб цэнах у іншых крамах... Комсамольцы гэта выканалі. Таксама хлопцы часта выпраўлялі памылкі ў прэйскуранце—загадчык за ўсім ня ўгледзіць...

Вельмі цікавіцца правядзеньнем кампаніі прыкашчыца магазыну № 40 комсамолка Шульман. Ёй прыходзілася некалькі разоў праглядваць накідкі, прэйскурант і ярлыкі на таварах, бо самая маленькая памылка тут ставіць у тупік і прыкашчыкаў і спажыўцоў. Шульман добра ведае пакольки процантаў і на які тавар зьнізілі цэны і чаму.

Намесьнік загадчыка магазынам № 15 комсамолец Коцін доўга бегаў пакуль дастаў добры, яскрава намаляваны прэйскурант. Цяпер прэйс-курант красуецца ў сярэдзіне магазыну...

* * *

Комсамольцы прылаўку толькі пачынаюць прасыпацца і прымаць удзел у кампаніі па зьніжэньню розьнічных цэн.

Мы павінны сказаць:

— Ганьба такім комсамольцам-прыказчыкам, як у магазыне № 59!

— Раўняйцеся па магазынам № 20 і 40!

Сашка Каліта.

Гэта што?



А хіба вы ня ведаеце? Ды гэта-ж нашы комсамольцы за «актыўным правядзеньнем кампаніі па зьніжэньню цэн». Не пазналі?

Крамныя „рэформы“.

(Талочын, Аршаншчына).

Чымсьці новым павеела ў мястэчковым аддзяленьні Белдзяржвыдавецтва. На відным месцы вісіць прэйс-курант цэн. Раней прэйс-куранту і ў паміне ня было.

Цэны у аддзяленьні значна панізілася: папера № 7 гладкая раней каштавала 4 р. 10 к. стапа, а цяпер—3 р. 80 к. Стапа лінейкай паперы № 7 замест 4 руб. 60 кап. каштуе 4 руб. 40 кап. Вучнёўскі сшытак прадаваўся 3 к., цяпер прадаюць па 2 з пал. к. Падзешавелі яшчэ канвэрты, цыркулі і г. д.

* * *

Ня ўсюды, аднак, такія вясёлыя малюнкі.

На дзьвярох аднаго магазыну спажывецкай коопэрацыі вісеў некалькі дзён прэйс-курант, а потым яго чамусьці зьнялі...

Зьніжэньне цэн у спажывецкай коопэрацыі маецца толькі на некаторыя тавары. Так мануфактура падзешавела на 5 процантаў, скура на 7, соль, галошы... А вось цэны на цукар засталіся такімі, якімі былі раней.

У мясной краме коопэрацыі маецца нават павялічэньне цэн на мяса. Але горш за ўсіх зьніжае цэны на наша сельска-гаспадарчая коопэрацыя «Селянін». Там **цэны зусім не зьмяніліся**. Быццам-бы кампанія прашла міма гэтай крамы...

Каму-ж, як не **«Селяніну»** трэба было ў першую чаргу зьнізіць цэны.

Міхась Зак.

Капейкі варушацца...

У МЦРК зьніжаюць

У мінулым нумары нашай газэты мы друкавалі шэраг вестак аб тым, як МЦРК праводзіць кампанію па зьніжэньню розьнічных цэн.

Зараз мы маем магчымасьць пазнаёміць чытачоў з апошнімі мерапрыемствамі МЦРК па зьніжэньню цэн, прынятымі 29-га сакавіка.

Пачынаючы з гэтага тэрміну дадаткова зьніжаны на цэлы шэраг тавараў. Вось факты:

Сьлівачнае масла замест 2 р. 95 к. каштуе 2 р. 90 к. Масла экспортнае—з 2 р. 60 к. зьнізілася ў цане да 2 р. 50 к. Дзясятак яечак замест 45 к.—40 к. Кілё дрожаў каштавала 1 р. 90 к., а цяпер—1 р. 80 к. Рысу кілё замест 58—53 к.

Цэны на мануфактуру ў агульным зьнізіліся на 8, 9 проц. Так мэтр бязі замест 42 к.—каштуе 39, мэтр паркалю каштаваў раней 38 к., а цяпер—36 к. Палатна мэтр. з 40 к. зьнізіўся да 38 к., сацінu мэтр каштаваў 55—цяпер 51 к.

Цэны на галантарэю ў агульным зьнізіліся на 6 процантаў. Напрыклад верхняя мужчынская кашуля да апошняга часу каштавала 5 руб. 25 кап., а цяпер каштуе 4 р. 75 к., спартыўная кашуля з 2 руб. 60 кап. зьнізілася ў цане да 2 р. 40 к.

Значна зьнізіліся цэны на парфуму.

Мыла карболавае замест 20 к.—15 к. кавалак, мыла для лазьні каштавала 30 к. зараз—25 к. Зубны парашок замест 13 к.—10 к.

* * *

І зараз, калі масавы спажывец зойдзе ў краму МЦРК за якім небудзь з вышэйпералічаных тавараў, ён навочна адчуе, што зьніжэньне цэн ня пусты гук, што зьніжэньне цэн праводзіцца ў жыцьцё. Хоць павольна але ўпарта, Менцэрабкоп трымае курс на зьніжэньне цэн і, як бачыце, дасягае пажаданых вынікаў.

З—р.

Чаму?

Нас цікавіць адно пытаньне—пытаньне аб сале.

На рынку ў прыватнага гандляра кілё сала каштуе 1 р. 18 к.

У краме № 1 ТПОМББ кілё такога-ж сала каштуе 1 р. 25 к.

А ў краме № 21 МЦРК тое-ж самае сала каштуе 1 р. 30 к. кілё.

Г.

НА ГАЛУБІНАЙ ВАКОЛІЦЫ



На Пярэсьпе—„галубінай ваколіцы“ Менску—ціха. Толькі што пракрычалі гудкі заводаў і па гразных, крывых вулічках прашлі рабочыя.

З-за рогу выбягаюць хлапцы гадоў 17—18, з кошыкамі ў руках, дастаюць галубоў і з бліскучымі вачыма сочаць за налетам... Яны—не адзінныя... Вось яшчэ група хлапцоў пушчае ў шэры аксаміт раніцы стаі птушак... Яшчэ, яшчэ...

Галубы—гэта ўсеагульнее каханьне ваколіцы. Захапленьне гэтым «спортам“ дасягае надзвычайных разьмераў...

Аднойчы некалькі хлапцоў накінуліся да другога, каб забраць голуба. Хлапчук, прыціснуўшы птушку да грудзей, ярасна адбіваўся. І нават калі фінскі нож „заехаў» яму ў бок, ён акрываўленай рукой усё трымаў птушку... Іраптам шалёна закрычаў, убачыўшы, што нож закрануў і голуба,..

На заўтра—гэта ўсё чыстая праўда—адбылося пахаваньне птушкі. Усе „галубятнікі“ ваколіцы сабраліся на „памінкі»... Выбралі месца над сажалкай“ выкапалі ямку і з сьлязьмі засыпалі магілку...

Гэта напамінае дзіцячую гульню, але як ня дзіўна ў гэтай гульне прымалі ўдзел і дарослыя сур'ёзныя людзі...

Такія крывавыя гісторыі канчаюцца часта значна горш. Вось нядаўна на Пярэсьпе з-за галубоў забілі чалавека. Часта бываюць дракі „фінкамі“... Гора таму „галубятніку“, які пакрадзе ў другога галубоў! Усе вокны ў яго хаце будуць пабіты, самога „галубятніка“ моцна „памнуць“ дзе небудзь у цёмным кутку, а ўсім яго галубам будуць адарваны галавы, нанізаны на нітачку і павешаны на дзьвярох іх хаты.

Цэлымі днямі хлопцы, ахопленыя галубінай „ліхаралкай“, бегаюць па вуліцы, пушчаюць птушак, ці сядзяць на даху і ладзяць „хаты“ для галубоў. Ня думайце, што гэта людзі, якім няма чаго больш рабіць. Тут вы сустрэнеце і школьніка, які закінуў заняткі, і рабочага—прагульшчыка, і піонэра, і комсамольца... Усё жыцьцё гэтых людзей запаўняюць... галубы. Іншыя інтарэсы ім невядомы.

Вось некалькі характэрных тыпаў „галубятнікаў»:

ВІНЦУС В.—хлапец 18-ці год. Рабочы Заходняй чыгункі. Усе грошы, якія атрымоўвае (30 р.), аддае на галубоў.

ЛЕНЬКА Б. уцёк ад бацькі, які б'е яго за тое, што ён ганяе галубоў. Днём крадзе дровы, ноччу сьпіць на вокзале. Мае ад роду 16 год.

ВАНЬКА Я. вышаў з піонэрскага атраду, які быў процiў яго захапленьня галубіным „спортам».

ЯСЬКА Ч. — 20-цігодні чорнарабочы. Днём пасярод вуліцы ганяе галубоў і лічыць гэта „самым лепшым у гэтым жыцьці“...

Гэта ўсё так званыя „беднякі“. Яны маюць па 10—12 галубоў.

Але ёсьць «галубятнікі“ і пастарэй, і пабагацей. У дзядзькі Т.—рабочага чыгункі МББ—звыш 40 галубоў. Пасьля працы ён лезе на гару і да цёмна сядзіць з любімымі птушкамі —„Вось мае дзеці“—кажа ён...

У хаце шаўца В. поўна галубоў. У маленькім пакойчыку жыве **3 чалавека** і **80 птушак**. Можна сабе ўявіць, якая ў хаце атмосфэра і чыстата!

А колькі ёсьць так званага „галубінага пролетарыяту“. Гэта тая катэгорыя людзей, якая ня мае ўласных птушак, а толькі дапамагае другім „галубятнікам“... „Пролетарыят“ падсьпявае, купляе гарох, ловіць птушак, б'ецца ў вокны...

Усе гэта—будні.

А як прыдзе нядзеля ўсе „галубятнікі“ ад мала да вяліка ідуць на Траецкую гару.

Там—кірмаш галубоў.

Купляюць, прадаюць, мяняюць і крадуць галубоў. Галубы вельмі дарагія! Некаторыя пародзістыя пары каштуюць па 50—60 руб. І думаеце ня купляюць? Апошнюю рэч „загоняць“ а галубо абавязкова набудуць!

Калі шчасьліваму „галубятніку“ ўдаецца прадаць птушку, ён піша пісульку, вешае на шыйку другому галубку і пушчае... А дома ўжо чытаюць па складох: „Ванька, прадаў „леньцістага“... Лафа!“

Калі ў аднаго рабочага—старога „галубятніка“ запыталі, чаму ён так кахае гэты „спорт“, ён адказаў:

— У Ангельшчыне лорды трымаюць галубоў... а чым мы горш?

— Але якую гэта дае карысьць?

— Не карысьць, а пацеху,..

Можа ня ўсе яшчэ ведаюць, якія вынікі гэтай „пацехі“.

Армія „галубятнікаў“ налічвае каля тысячы чалавек. З кожным днём армія павялічваецца. „Галубіная ліхарадка“ зрывае на акраінах усю, праўда вельмі невялічкую, культурную працу. Чалавек, які ведае толькі аб сваіх галубох, які цікавіцца толькі гэтым „спортам“ ужо ня зойдзе ў клюб, ня сядзе за кніжку...

Цікавы прыклад: адзін піонэрскі аттад ваколіцы ледзь не распаўся, бо ўсе хлапцы ганялі галубоў.

Мы ня супроць галубоў, але супроць дзікага захапленьня гэтымі бескарыснымі, азартнымі заняткамі.

Недарма на адным перавыбарным сходзе ў наказ новаму горсавету быў устаўлен пункт аб „разгоне галубятнікаў“.

Блакітны Эдуард.

„Лінія“

З судовых спраў.

(Ад нашага Віцебскага спэцкор...

Ольга Быкава была замужам ужо другі раз. З другім **мужам Сьцяпанам Іва...вым** яна жыла ўвесь час добра...

Ад першага мужа ў яе засталася да...ка Праскоўя. Вясковыя хлопцы ухажва...ва прыгожай Праскоўяй... Ласкава загав...валі з ёй, звалі на вечарынкі, праважа... па вечарох дахаты. Гэта, аднак, ня бы... па сэрцу старому Сьцяпану. Ён праган... хлапцоў, лаяўся з імі і пагражаў „пам...лаціць калі не адстануць ад Праскоўі“.

У хуткім часе выявілася. Сьцяп... трымаўся такой „лініі“.

Аднойчы, калі ў хаце акрамя Пр...коўі і Сьцяпана нікога ня было, апо... зьвярнуўся да дзяўчынкі з такой пра...новай:

— Будзем жыць... як муж з жонкай... Хочаш?—і схапіў яе за руку.

Закрычала Праскоўя, хацела выбег... з хаты, але стары ня пусьціў.

Доўга ў хаце ішло змаганьне, паку... Праскоў не ўдалося уцячы.

З тэй пары адносіны паміж мужам... жонкай значна пагоршыліся. Сьцяп... усю сваю злосьць вымяшчаў на жон... Пачаліся сваркі.

На вёсцы загаварылі аб тым, ... Сьцяпан абяцаўся да калядь „зжыць ...сьвету“ сваю жонку Вольгу.

І вось аднойчы, калі Вольга з д...кою ішлі з вечарынкі, вёска пачула ... стрэлы... Два трупы ўпалі на зямлю...

* * *

Віцебскі акруговы суд прыгавар... забойцу жонкі і прымачкі **Сьцяпана Іва...ва** да 8 год зьняволеньня са строгай і...ляцыяй.

Мік. Тау...

Адказы чытачам.

Дударэнку (№ 873). Па пытаньню ... сваёй хваробе ты павінен зьвярнуцца да м...оцага ўрача. Ён табе дасьць належныя па...заньні.

Саўчэнку (№ 874). Калі райком уст...маўся ад рэкомэндацыі цябе ў партыю, пры паўторнай падачы анкеты павінен з... прайсьці праз бюро комсамольскай ячэйкі.

Залескаму (№ 875). У кожнай акр... ўстанаўляецца асобны тэрмін правядзен... конфэрэнцый вучнёўскай моладзі.

Яму-ж (№ 876). Калі бюро і агуль... сход ячэйкі рэкомэндуюць цябе ў вучком, ... на вучнёўскім агульным сходзе ня маеш пра... як комсамолец, зьнімаць сваю кандыдатуру.

Яму-ж (№ 877). У часопісь „Малад...“ вершы, апавяданьні і інш. трэба пісаць на ...ларускай мове.

Левікаву (№ 878). Аддзяленьні Дзяржв...давецтва даюць у крэдыт падручнікі толькі ...ганізацыям, так што ты можаш атрымаць ... крэдыт падручнікі праз вучком ці школьком.

Галкоўскаму (№ 879). Калі цябе адмі...страцыя няправільна зволіла са службы, настаў аб гэтым пытаньне на РКК.

Вучням (№ 880). У часе дэмонстра... вучні-комсамольцы і піонэры не павінны ...лучацца, а ідуць разам са школай, сумесна ... ўсімі вучнямі.

Гарадзецкаму (№ 881). З адукацыяй ШС... можна паступіць у сельска-гаспадарчы тэх...кум.

Што будзе — у — Смалявічах 2 і 3 красавіка

У суботу 2-га красавіка, ў 6 гадзін веч...ра, ў м-ку Смалявічы, адбудзецца нара...

КОРЭСПОНДЭНТАЎ І ЧЫТАЧОЎ комсамольскіх газэт

па пытаньню **«як пісаць у газэт... і як працаваць з газэтным ма...тар'ялам».**

У нядзелю 3-га красавіка ў нардоме а... будзецца адчынены сход мястэчковай **організацыі ЛКСМБ** сумесна з беспартыйнай моладзьдзю.

На сходзе—даклад газэты **„Чырвоная Зьмена“.**

Пасьля дакладу—вечар самадзейнасьці гумарыстычная газэта.

У Смалявічы выяжджае прадстаўнік **«Чырвонай Зьмены».**

Смалявіцкі РК ЛКСМБ

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“

Апавяшчэньне

Клюб КІМ

У нядзелю, 3 красавіка, а 5 гадзі... адбудзецца пасяджэньне клюбнай камі... сумесна са старшынямі юнсэкцый.

На парадку дню пытаньне аб пера... барах бюро юнсэкцый.

Прысутнасьць сяброў клюбнай камі...сіі: т. т. Рубенчыка, Жукоборскага, Бу...ловіча, Розэнталя, Крука, Сямёнава ... старшын юнсэкц. кл. Працасьветы Леніна ... Ільліча, Нархарчаўнікоў, Гарбароў, Са... гандслужачых, Друкароў, Мэдсантру... Будаўнікоў і Саматужнікаў абавязкова.

Запрашаюцца старшыні масавых ка...місій.

Клюбная камісія АК...

Згублены:

○ Комсамольскі білет № 42582 на ім... Галерштэйн Хамы, выдадзены Менакругкома... ЛКСМБ.

○ Часовае пасьведчаньне № 263 на ім... Бусловіча Саламона, выдадзенае Слуцкім ак...ругкомам ЛКСМБ.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867. Менск, 2 друкарня БДВ.